“КАЛІСЬ ГЛЯДЗЕЎ НА СОНЦА Я...”

ГАЛЕРЭЯ ПАРТРЭТНЫХ ВОБРАЗАЎ ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА



***Сяргей Грыневіч*. Партрэт Максіма Багдановіча.**

1998 г. Палатно, алей.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.


РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ

ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

ЗАГАДКІ “ВЯНКА” МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Зборнік “Вянок” (1913) Максіма Багдановіча – адна з самых знакамітых і даследаваных кніг у гісторыі беларускай літаратуры. Аднак і яна хавае некалькі загадак.

Да канца нявызначана, хто быў рэдактарам кнігі. Можна знайсці сцверджанні, што ім выступіў Янка Купала. Але супярэчыць гэтаму зусім невялікі аб’ём ліставання двух геніяльных паэтаў – пара лістоў і паштовак (не зберагліся). Разам з тым захавалася перапіска Максіма Адамавіча з Вацлавам Ластоўскім, дзе паэт абмяркоўвае будову кнігі, дадаткі і праўкі. Згодна з успамінам самога В. Ластоўскага, менавіта ён аўтар назвы, ініцыятар прысвячэння “Вянка” Сяргею Палуяну, а таксама вокладкі. Паўдзельнічаў В. Ластоўскі і ў пошуку грошай на выданне. Сам ён абазначаў сябе як “выдавец”, але супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча схіляюцца да думкі, што ён выконваў і рэдактарскія функцыі.


МАКСІМ БОГДАНОВІЧ.

ВЯНОК

кніжка выбраных вершоў.

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ МАРЦІНА КУТЫ.
1913.

Тытульная старонка “Вянка” М. Багдановіча з аўтографам.

У адрозненне ад паасобных выданняў Марціна Кухты, той жа “Курганнай кветкі”, мы не ведаем імя мастака, чыю працу бачым на вокладцы “Вянка”. В. Ластоўскі піша: «Рысунак на акладку даў я са свайго сабрання. Гэты рысунак у 1905 г. зрабіў адзін з вучняў (не памятаю яго прозвішча) Штыгліцаўскай школы. Рысунак напамінае крыху вянок, дзеля гэтага я і пастанавіў, карыстаючы правамі выдаўца, надпісаць на кніжцы да аўтарскага яшчэ і свой агаловак – “Вянок”. Выходзіла нязгорш: “Вянок, кніжка выбраных вершаў”». Зазначым, што, згодна з задумай М. Багдановіча, зборнік не меў назвы – “*Кніжка выбраных вершоў*”, як потым напісалі ў падзагалоўку. Пошукі мастака з характэрным стылем сярод навучэнцаў вучэльні пакуль поспеху не прынеслі.

Адна з самых вялікіх загадак “Вянка” – магчымае існаванне кнігі лацінскім шрыфтам. Ганна Запартыка звяртае ўвагу, што ў тэксце “Opis kniharni Bielaruskaho wyd. T-wa u Wilni, zdadzienych Apiekunčaj Kamisii 23.04.1917 h.” апроч кірылічнага варыянта згадваецца назва кнігі лацінкай “46 – Wianok – 50 – 18.00” і “30 – Wianok – 50 – 15.00”, дзе першы лік – колькасць экзэмпляраў, а пасля назвы ідзе цана і агульная сума. Кірылічных “Вянкоў” у кнігарні заставалася 1355 асобнікаў па 50 капеек кожны – усяго на 677 рублёў 50 капеек. Ці гэтая згадка – усяго толькі прывычная аўтару вопісу лацінка, ці такі “Вянок” сапраўды існаваў – невядома. Адзін з удзельнікаў гурта “Песняры” цягам экскурсіі ўпэўніваў супрацоўнікаў, што такая кніга была падорана Уладзіміру Мулявіну, калі калектыў працаваў над адпаведнай праграмай, і быццам бы яны ўсім саставам разглядалі “Вянок”, набраны лацінкай, але пацвердзіць інфармацыю не атрымалася.

Супрацоўнікі музея збіраюць звесткі пра ўсе зборнікі “Вянка” (1913), якія зберагліся да нашага часу. Амаль кожны з іх мае адметных уладальнікаў і сваю гісторыю. Такіх кніг сёння вядома 47. У фондах музея зберагаецца шэсць, тры з іх з аўтографамі паэта.

Зборнік “Вянок”, які прапануем для праекта “Рэчы і гісторыі”, мае подпіс “*Сестрице Нюте от любящего ее автора. 22.03.1914 г. М. Богданович*”. Дата і адрасат невыпадковыя. Хутчэй за ўсё, менавіта ў гэты дзень паэт атрымаў аўтарскія асобнікі і адразу зрабіў надпісы сваякам і таварышам. Пра стрыечную сястру Нюту (Ганну) Гапановіч і яшчэ адзін артэфакт, з ёй звязаны, мы апавядзем неўзабаве.

А напрыканцы закранем яшчэ адну загадку “Вянка”: хутчэй за ўсё, нягледзячы на выхадныя дадзеныя, з-за тэхнічных замінак кніга прыйшла да чытача толькі ў 1914 г. Таму і рэцэнзія Антона Луцкевіча на яе крыху запозненая, і аўтар доўгачаканую кнігу атрымаў толькі ў сакавіку 1914-га.

Міхась БАРАНОЎСКІ,
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.